ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982
7
КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 27 (1365)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
· Учора · Сёння · Заўтра ·

## СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫЯ

сходы праходзяць у пярвічных прафсаюзных арганізацыях супрацоўнікаў універсітэта. 11 факультэтаў ужо правялі справаздачы, у астатніх падраздзяленнях сходы завершацца да сярэдзіны кастрычніка.

**У. ШАЛАТОНІН,**
**намеснік старшыні мясцкома.**

## ЭКСКУРСІЯ

па аддзелу рэдкай і каштоўнай кнігі бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна прайшла ў другакурснікаў гістарычнага факультэта вячэрняга аддзялення. Навучэнцы азнаёміліся з экспазіцыяй «Гісторыя кнігі», убачылі прыжыццёвыя выданні твораў У. І. Леніна, аўтографы, даравальныя і ўладальніцкія надпісы на кнігах з фондаў бібліятэкі, лепшыя выданні апошніх гадоў.

**А. СЯНКЕВІЧ,**
**загадчык аддзела рэдкай і каштоўнай кнігі.**

## ТРЭЦІ СІМПОЗІУМ

мовазнаўцаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна і Сафійскага універсітэта імя Клімента Ахрыдскага «Беларуска-балгарскія моўныя сувязі» прайшоў на філалагічным факультэце.

**З. АЛЯШКЕВІЧ.**

## КАМІТЭТ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

правёў чарговае пасяджэнне на якім прысутнічалі старшыні груп НК падраздзяленняў.

Былі абмеркаваны пытанні, прысвечаныя пачатку заняткаў у школах народных кантралёраў, вызначаны задачы груп у святле пастановы Камітэта Народнага кантролю СССР «Аб выніках вывучэння работы некаторых груп і пастоў народнага кантролю і прычын пасіўнасці часткі народных кантралёраў у выкананні сваіх абавязкаў».

**А. КАСПЯРОВІЧ,**
**старшыня камітэта НК.**




# Свята нашай дзяржаўнасці

7 КАСТРЫЧНІКА савецкі народ адзначае Дзень Канстытуцыі. Пяты год дзейнічае і працуе новы Асноўны Закон нашага жыцця. У гэтым дакуменце заканадаўча замацаваны ленінскія прынцыпы грамадства новага тыпу — сацыялістычнай садружнасці нацый, высокія ідэалы нашага жыцця, галоўны з якіх: усё для чалавека, усё ў імя чалавека.

Грандыёзныя змены адбыліся ў гісторыі нашай краіны за гады Савецкай улады. У Сібіры і на Далёкім Усходзе выраслі прыгожыя гарады. У спякотных пустынях Сярэдняй Азіі зацвілі маладыя сады, а дзікія прасторы Поўначы адкрылі для людзей свае таямніцы. Некалі прыгнечаны і бяспраўны чалавек стаў гаспадаром сваёй краіны. З кожным днём расце дабрабыт савецкіх людзей. І ўсё гэта, дзякуючы тым рэальным палажэнням, якія пакладзены ў аснову нашага жыцця Канстытуцыяй СССР.

Створаная воляй народа пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, наша Канстытуцыя нарадзілася разам з Савецкай дзяржавай. Яе палажэнні — у радках ленінскага Дэкрэта аб міры і зямлі, аб роўнасці ўсіх нацый і народнасцей нашай шматнацыянальнай краіны. І сёння, напярэдадні вялікага юбілею—60-годдзя з дня ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік — мы з гордасцю адзначаем, што ў СССР склалася новая гістарычная супольнасць людзей — савецкі народ. Сёння, як ніколі раней, адчуваецца прыналежнасць лёсу кожнага з нас да лёсу Радзімы, непарушнасць радоў савецкіх людзей, што ўпэўненай хадой крочаць у камунізм. Унукі тых, хто штурмаваў Зімні, дзеці тых, хто вызваляў свет ад фашысцкай нечысці, поплеч узводзяць фабрыкі і заводы, узнімаюць цаліну, пакараюць касмічныя прасторы. Рускі і ўкраінец, казах і беларус сталі сёння братамі па перакананню, па загаду розума і сэрца.

Учора мы жылі з верай у дзень сённяшні, сёння жывём, упэўненыя ў дні заўтрашнім. Упэўненасць гэтая — у самім ладзе нашага сацыялістычнага жыцця, у нашай савецкай дзяржаўнасці. «Цяпер кожны савецкі чалавек,— гаварыў Леанід Ільіч Брэжнеў,— упэўнены ў тым, што ён ніколі не стане беспрацоўным, што ён атрымае неабходную адукацыю, што яго дараванні і таленты знойдуць прымяненне, што ён не будзе кінуты на волю лёсу ў выпадку хваробы, што ён забяспечаны на старасці гадоў, што ён можа быць спакойны за лёс сваіх дзяцей».

МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

# Па праграме міжнародных сувязей

ЯК РАЗВІВАЕЦЦА маладзёжная прэса ў Беларусі? У чым сутнасць партыйнага кіраўніцтва друкам у СССР?

З гэтых пытанняў пачалася гутарка паміж старшынёй праўлення Саюза журналістаў БССР, рэдактарам газеты «Звязда» А. А. Тоўсцікам і гасцямі, студэнтамі-журналістамі з ГДР.

Даўняя, трывалая дружба звязвае студэнтаў факультэта журналістыкі Ленінградскага універсітэта імя А. А. Жданава і універсітэта імя К. Маркса ў Лейпцыгу. Кожны год студэнты чацвёртых курсаў універсітэтаў-пабрацімаў прыязджаюць адны да аднаго на вытворчую практыку. Гэтым летам група ленінградцаў пабывала ў гасцях у сваіх сяброў з ГДР, пазнаёмілася з работай шэрагу газет, часопісаў, радыё і тэлебачання рэспублікі, наведала прадпрыемствы і ўстановы, культурныя і навуковыя цэнтры. А потым нямецкія студэнты прыехалі на практыку ў Савецкі Саюз.

Яе пачаткам і стала знаёмства студэнтаў з беларускім друкам, з факультэтам журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна. Нямецкія сябры былі гасцямі праўлення Саюза журналістаў БССР, дзе атрымалі адказы на шматлікія пытанні, што цікавілі іх. А праз дзень іх ужо сустракалі выкладчыкі і студэнты факультэта журналістыкі. Гасцей горача віталі дэкан П. І. Ткачоў, намеснік дэкана І. І. Сачанка, супрацоўнікі і студэнты журфака.

Пытанні, якія былі зададзены ў час размовы, і адказы на іх, думкі, якія былі выказаны ў ходзе сустрэчы, дапамогуць у далейшым удасканальваць арганізацыю падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў, узбагаццяць вопыт выпуску газет і часопісаў.

Акрамя гэтага, у ходзе размовы намеціўся шэраг новых карысных сувязей паміж Беларускім і Ленінградскім універсітэтамі, што, безумоўна, прывядзе да больш глыбокага вывучэння праблем журналістыкі савецкімі студэнтамі.

Праграма практыкі нямецкіх студэнтаў прадугледжвае не толькі дзелавыя сустрэчы, але і знаёмства з культурнымі каштоўнасцямі нашай краіны, гераічным мінулым савецкага народа. Намаганнямі факультэта і праўлення Саюза журналістаў БССР для гасцей з ГДР былі праведзены экскурсіі па гораду, арганізавана паездка ў Хатынь, нямецкія студэнты наведалі Беларускі Дзяржаўны музей мастацтва, ВДНГ БССР.

**У. ДЗІДЭНКА,**
**студэнт факультэта журналістыкі ЛДУ імя А. Жданава.**

НЯДАЎНА універсітэт наведала дэлегацыя італьянскіх камуністаў, якую ўзначальваў Луіджы Сандзірока — член ЦК ІКП, першы сакратар федэрацыі ІКП вобласці Абруцы.

Члены дэлегацыі былі прыняты ў рэктараце і парткоме, наведалі музей універсітэта. У час размовы госці праінфармаваны аб дзейнасці партыйнай арганізацыі, усяго калектыву універсітэта па выкананню гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС, азнаёмлены з дасягненнямі БДУ імя У. І. Леніна ў развіцці навукі і адукацыі.

Фота **В. Шачака.**



# ВАС, ЦІКАЎНЫЯ, ДАПЫТЛІВЫЯ, ЗАХОПЛЕНЫЯ, —

## ДРУГАЯ ГРАМАДСКАЯ

ВЫПУСКНІКІ сярэдніх школ атрымліваюць сваю будучую спецыяльнасць у ВНУ, тэхнікумах, вучылішчах. Расце змена старэйшым пакаленням будаўнікоў, настаўнікаў, вучоных, інжынераў... Гэта асноўныя прафесіі, якія выбіраюцца чалавекам на ўсё жыццё. А што ж такое другая прафесія, што называецца грамадскай? Дзе яе можна атрымаць?

Скончыўшы ВНУ, студэнт едзе па накіраванню. Дыплом аб заканчэнні факультэта грамадскіх прафесій дае яму магчымасць быць не толькі кваліфікаваным удзельнікам аднаго з гурткоў мастацкай самадзейнасці, але і кампетэнтным, тэарэтычна падрыхтаваным кіраўніком гэтага аб'яднання. У нашай рэспубліцы не хапае рэжысёраў, хормайстраў, якія маглі б узначальваць гурткі мастацкай самадзейнасці. Падрыхтоўка кіраўнікоў гэтых калектываў,— адна з галоўных умоў далейшага развіцця народнага мастацтва ў рэспубліцы.

Вялікую ролю ў гэтай справе адыгрываюць факультэты грамадскіх прафесій вышэйшых навучальных устаноў. У БДУ імя У. І. Леніна факультэт грамадскіх прафесій створан у 1964 годзе, і працавала ў той час на ім пяць аддзяленняў: хормайстраў, харэаграфічнае, рэжысёрскае, піянерскіх важатых, лектараў-міжнароднікаў. Цяпер на факультэце 16 аддзяленняў: школа маладога лектара, школа арганізатараў грамадска-палітычнай работы, аддзяленні арганізатараў ваенна-патрыятычнай работы, мастацкага слова, фотакарэспандэнтаў, харэаграфіі, бальных танцаў, кіраўнікоў агітбрыгад, журналістыкі, эстэтыкі быту, піянерскіх важатых, грамадскіх інструктараў па спорту, мастакоў-афарміцеляў, стэнаграфіі.

З кожным годам расце колькасць жадаючых займацца на факультэце грамадскіх прафесій. У 1981-82 навучальным годзе на факультэце займаліся 1324 слухачы. На гэтым моманце патрэбна спыніцца. Насцярожвае той факт, што на вучобу на факультэт грамадскіх прафесій камітэты камсамола накіроўваюць у асноўным першакурснікаў. А хацелася б, каб больш было студэнтаў 2—3 курсаў, якія ўжо асвоіліся ў вучобе, умеюць планаваць свой рабочы час, другую спецыяльнасць, грамадскую, для сябе выбіраюць з веданнем справы. А першакурснікі, як правіла, шмат за што бяруцца, але далёка не ўсё даводзяць да канца. Некаторыя першакурснікі раней займаліся мастацкім словам, харэаграфіяй, у спартыўных секцыях і могуць працягваць падрыхтоўку на факультэце грамадскіх прафесій. Звяртаюся да сакратароў камітэтаў камсамола факультэтаў: «Падумайце, ці не вельмі цяжкую ношу мы адразу ж узвалілі на плечы першакурсніку!» Да таго ж студэнты другога-трэцяга курсаў застаюцца без пастаянных камсамольскіх даручэнняў, а вучоба на факультэце грамадскіх прафесій — камсамольскае даручэнне.

Тут жа ўзнікае і другое пытанне. Вельмі часта на аддзяленне прыходзяць студэнты, якія не маюць ніякіх задаткаў для гэтай работы. Спытаеш: «Чаго вы прыйшлі на гэта аддзяленне?» Чуеш у адказ: «А мяне накіравалі з камітэта камсамола». Без асабістага жадання, здольнасцей нельга накіроўваць студэнтаў на факультэт грамадскіх прафесій.

Камітэты камсамола мала ўвагі ўдзяляюць набору студэнтаў на аддзяленні. Не за колькасцю мы павінны гнацца, а за якасцю. Патрэбна вызначыць сапраўды здольных слухачоў факультэта грамадскіх прафесій, якія ў далейшым змогуць у школах, установах, на заводах арганізоўваць гурткі па інтарэсах.

Нямала хвалюе дэканат факультэта грамадскіх прафесій і тое, што ў школе маладога лектара вучацца ў асноўным першакурснікі, якія толькі пачынаюць разумець, што такое лекцыя. Як жа яны змогуць чытаць кваліфікаваныя, самастойна падрыхтаваныя лекцыі?

Многа гавораць пра факультэт грамадскіх прафесій. Але некаторыя студэнты па-ранейшаму пытаюцца: «А навошта ён мне?» Я думаю, што такое пытанне ніколі не паўстане перад цяперашнімі лаўрэатамі гарадскога агляду-конкурсу чытачоў-выканаўцаў, прысвечанага стагоддзю з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Я. Купалы і Я. Коласа. Не ўзнікла яно і ў А. Мятліцкага, які пасля заканчэння мехмата працуе ў Гродзенскім універсітэце і там арганізаваў аддзяленне мастацкага слова на факультэце грамадскіх прафесій. Многія слухачы школы маладога лектара паказалі сябе, згодна афіцыйным водгукам, прамоўцамі, якія падаюць надзеі. Рабяты з удзячнасцю ўспамінаюць В. М. Брэка, які навучыў іх усім сакрэтам фатаграфіі. Свае веды яны паспяхова праявілі ў якасці грамадскіх фотакарэспандэнтаў у час працоўнага семестра 1982 года. І. Папурэнка ўдасканаліла свой журналісцкі ўзровень, займаючыся на аддзяленні журналістыкі, яе заметкі рэгулярна друкуюцца ў газеце «Чырвоная змена». Нямала рабят, якія прайшлі школу аддзялення харэаграфіі народнага ансамбля танца «Крыжачок», цяпер арганізавалі ў школах Мінска і рэспублікі дзіцячыя харэаграфічныя калектывы. Выпускніца аддзялення бальнага танца С. Танушкіна з'яўляецца кіраўніком гуртка бальнага танца на Мінскім камвольным камбінаце.

Лепшыя слухачы аддзялення мастацкага слова прымалі ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні юбілейнага канцэрта, прысвечанага 60-годдзю універсітэта. Вялікую дапамогу камітэтам камсамола ў афармленні стэндаў аказваюць мастакі-афарміцелі. Нямала слухачоў і выпускнікоў школы арганізатараў грамадска-палітычнай работы актыўна працуюць у камсамольскіх і прафсаюзных арганізацыях.

З 20 кастрычніка 1982 года пачынаецца новы навучальны год на факультэце грамадскіх прафесій БДУ імя У. І. Леніна. Камітэтам камсамола факультэтаў неабходна правесці вялікую работу сярод студэнтаў, аформіць стэнд пра факультэт грамадскіх прафесій, выпусціць газеты, правесці гутарку з усімі жадаючымі займацца на аддзяленнях ФГП.

Вопытныя, кваліфікаваныя выкладчыкі універсітэта, дзеячы навукі і культуры, выкладчыкі іншых ВНУ і арганізацый будуць праводзіць заняткі з нашымі слухачамі ў гэтым годзе.

Задачы перад факультэтам грамадскіх прафесій стаяць вялікія. І галоўная з іх — павышэнне актыўнасці слухачоў і выпускнікоў, стварэнне больш цеснай сувязі тэарэтычнага курса з практычнай дзейнасцю студэнтаў. Неабходна дабіцца, каб кожны слухач школы і выпускнік факультэта грамадскіх прафесій з'яўляўся кіраўніком таго ці іншага гуртка ў школе, спартыўнай секцыі, актыўным членам таварыства «Веды». Думаецца, што дэканат ФГП разам з камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыямі універсітэта паспяхова вырашаць усе задачы, якія пастаўлены партыяй перад факультэтамі грамадскіх прафесій.

**В. ГУСКО,**
**метадыст факультэта грамадскіх прафесій.**



Кіраўнік аддзялення мастацкага слова Лідзія Васільеўна **Маркалёва** (у цэнтры) разам са сваімі навучэнцамі.

**Поўная адсутнасць фармалізму, сухіх паказчыкаў — не галоўнае, перш за ўсё трэба пашырыць свой кругагляд, атрымаць максімальную колькасць ведаў — вось асноўныя прынцыпы слухачоў ШКОЛЫ АРГАНІЗАТАРАЎ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОТЫ**

## ШКОЛА АКТЫЎНАСЦІ

КІМ БЫ мы ні сталі пасля заканчэння універсітэта: фізікамі, хімікамі, ці юрыстамі, нам давядзецца займацца грамадскай работай. Таму мы імкнёмся паралельна з асваеннем асноўнай прафессіі набываць неабходныя арганізатарскія веды.

Доўгі час пры камітэце камсамола дзейнічала школа камсамольскага актыву. Потым узнікла думка стварыць школу арганізатараў грамадска-палітычнай работы на факультэце грамадскіх прафесій. Слухачы школы маюць магчымасць падрыхтаваць сябе да наступных форм грамадскай работы: арганізацыя ўнутрысаюзнай работы ВЛКСМ, грамадска-палітычная практыка студэнтаў, Ленінскі залік, прафсаюзная работа, адпачынак моладзі, грамадская дапамога сацыёлагам.

Пра папулярнасць самага вялікага аддзялення факультэта грамадскіх прафесій гаворыць ужо той факт, што жадаючых паступіць на яго ў 1981-82 навучальным годзе было намнога больш, чым школа магла прыняць. Гэта тлумачыцца тым, што заняткі заўсёды цікавыя. Лекцыі чытаюць вопытныя спецыялісты. Залік у канцы года праходзіць не зусім звычайна: у форме гутаркі, дзе высвятляецца, што ўзяў для сябе слухач школы, чаму навучыўся.

— Што прывяло вас у школу арганізатараў грамадска-палітычнай работы? — з гэтым пытаннем звяртаюся да студэнтаў.

Наталля Яныш:

— Я займаюся на аддзяленні грамадскай дапамогі сацыёлагам. А сацыялагічныя даследаванні — вельмі важная і цікавая справа. Да таго ж вельмі каштоўна, што пры школе арганізаваны факультатывы, на адным з якіх я змагу авалодаць стэнаграфіяй.

Алена Грышкевіч:

— Мне заўсёды хацелася навучыцца мастацтву гаварыць і валодаць увагай аўдыторыі. Таму выбрала аддзяленне лекцыйна-прапагандысцкай работы.

А што дала школа арганізатараў грамадска-палітычнай работы тым, хто вучыцца другі год? Аб гэтым расказаў студэнт юрфака Аляксандр Дацэнка. Саша адзначыў, што пасля наведвання заняткаў школы, яму значна лепш і цікавей выконваць свае грамадскія абавязкі.

Побач з ім сядзіць Ігар Мікула, які прыйшоў сюды па прапанове сябра. Ігар — член камсамольскага бюро групы. Ён перакананы, што навучыцца ў школе не толькі навыкам грамадскай работы, але і многаму таму, што неабходна ведаць чалавеку яго прафесіі. Думаю, да яго слоў можа далучыцца кожны слухач школы.

**С. ЯСКЕВІЧ,**
**студэнтка журфака.**

## КЛІЧА ГАЗЕТНЫ РАДОК

**Жаданне навучыцца дакладна фармуліраваць і перадаваць свае думкі, аператыўна даносіць да чытача важныя факты, паведамляць пра цікавыя падзеі аб'ядноўвае навучэнцаў АДДЗЯЛЕННЯ ЖУРНАЛІСТЫКІ.**

КОЛЬКІ сябе памятаю, мяне заўсёды цягнула пісаць. Калі мае равеснікі яшчэ гулялі з лялькамі, я часта садзілася ў якім-небудзь куточку і выводзіла першыя нязграбныя літары. Якое задавальненне прыносіў мне гэты занятак...

Прайшоў нейкі час, і я стала пісаць словы, складаць сказы, а потым паспрабавала прыдумваць казкі. Але час казак мінаваў. Я імкнулася да чаго-небудзь больш сур'ёзнага. Неяк вырашыла напісаць у газету. Але аб чым пісаць і як? Спачатку напісала ў рэдакцыю ліст, у якім паведамляла, што хацела б друкавацца, але не магу знайсці патрэбнай тэмы. Хутка прыйшоў адказ, у якім была прапанавана тэма. Я напісала некалькі радкоў пра летнія канікулы. Заметку надрукавалі.

З таго часу пачалося маё супрацоўніцтва з газетай. Пісала таму, што гэта было цікава. І толькі, калі закончыла школу, канчаткова вырашыла: паеду ў Мінск і паступлю на журфак! Паехала, здала дакументы. І тут мяне спасцігла вялікая няўдача: я «праваліла» першы этап творчага конкурсу. Я ўжо хацела ехаць дамоў, каб праз год зноў паступаць на журфак. Але ўсе раілі: «Не губляй дарэмна год. Паступай на філфак. Журналістам зможаш стаць і з філалагічнай адукацыяй. Галоўнае — жаданне пісаць...» Хутка я стала студэнткай філфака БДУ. А калі яшчэ ў першыя месяцы вучобы нам прапанавалі запісацца на якое-небудзь аддзяленне факультэта грамадскіх прафесій, я, не задумваючыся, выбрала аддзяленне журналістыкі.

Вучацца на аддзяленні студэнты розных факультэтаў. Ёсць такія, якім, як і мне, не пашанцавала, і такія, што мараць акрамя асноўнаіі прафесіі навучыцца пісаць. Мы знаёмімся з гісторыяй і тэорыяй друку, спасцігаем законы газетных жанраў, вучымся працаваць над словам і прафесійна размаўляць з людзьмі, маем магчымасць друкаваць свае першыя матэрыялы не толькі ў сценгазетах, але і на старонках «Беларускага універсітэта». І ўжо амаль кожны з нас з трапятаннем убачыў сваё прозвішча пад заметкай у нашай шматтыражцы.

**Л. КАМАШКА,**
**студэнтка філфака.**

# ЗАПРАШАЕ ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ!



ЯК НАРАДЖАЕЦЦА прыгажосць? Дзе жыве яна, куды хаваецца, каб нечакана ўзнікнуць яркай зоркай, здзівіўшы свет сваім з'яўленнем?

Шукаем, чакаем і часта не ведаем, што яна побач, можа быць, у той самай спартыўнай зале, міма якой штодзённа праходзім. А трэба толькі адчыніць дзверы і... узаўецца паслухмяная стужка ва ўмелых руках прыгажуні — дзяўчыны, якая, магчыма, вучыцца разам з табой на адным факультэце. Кожны вечар яна прыходзіць сюды, і адбываецца чарадзейства пераўтварэння: замест сучаснай студэнткі ў джынсах і акулярах з'яўляецца Грацыя.

Трапяткія рукі, загадкавая ўсмешка, кожны жэст, кожны паварот галавы — усё стварае танец, гарманічны, як мелодыя скрыпкі, і імклівы, як рытм XX стагоддзя. І нават потым, калі яна зноў стане звычайнай дзяўчынай, у вачах яе застанецца нешта такое, цудоўнае і таямнічае, што міжволі прымусіць азірнуцца і зноў спытаць сябе: «Адкуль яна, прыгажосць?»

## КУЛІСЫ, АДКРЫТЫЯ ДЛЯ ЎСІХ

**Танцы—гэта прыгожа. Танцы—гэта цяжка. Танцы—гэта захапленне на ўсё жыццё. Так лічаць навучэнцы ХАРЭАГРАФІЧНАГА АДДЗЯЛЕННЯ.**

НА БАЗЕ Народнага ансамбля народнага танца «Крыжачок» працуе аддзяленне харэаграфіі, якое рыхтуе кіраўнікоў самадзейных танцавальных калектываў. Кожны ўдзельнік ансамбля атрымлівае дыплом кіраўніка самадзейнага харэаграфічнага калектыву.

Тут вучаць танцаваць усіх жадаючых. У ансамблі працуе асноўная, падрыхтоўчая і аркестравая групы, у якіх займаецца больш за 60 студэнтаў, прадстаўнікоў усіх факультэтаў універсітэта. Самадзейныя артысты паспяхова вучацца, многія з іх актыўна ўдзельнічаюць у навуковай рабоце. Кожны ўдзельнік ансамбля, як правіла, з'яўляецца кіраўніком мастацкай самадзейнасці на сваім факультэце.

«Крыжачок» не быў бы «Крыжачком», калі б яго састаў пастаянна не амаладжваўся. За пяць гадоў універсітэцкага навучання артысты студэнцкага танцавальнага ансамбля дасягаюць высокага ўзроўню выканаўчага майстэрства. «Крыжачок» прадстаўляў беларускае мастацтва ў розных рэспубліках СССР, выступаў перад хлебаробамі Казахстана і будаўнікамі Сібіры, рыбакамі Балтыкі і вінаградарамі Крыма.

«Крыжачок» выступаў у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, Народнай Рэспубліцы Балгарыі, Польскай Народнай Рэспубліцы, Аўстрыі, Анголе.

А новае пакаленне, якое прыйдзе ў ансамбль, будзе спасцігаць асновы танцавальнага майстэрства.

**М. ЛАПША,**
**мастацкі кіраўнік народнага ансамбля танца «Крыжачок», заслужаны работнік культуры БССР.**

## ВУЧАЦЦА... ДЭМАСФЕНЫ

**Як вы ведаеце, Дэмасфен, які імкнуўся стаць прамоўцам, хадзіў па беразе мора і гаварыў свае выступленні з набітым каменнем ротам. Так ён перадольваў уласную коснаязыкасць. Каб навучыцца кваліфікавана размаўляць з аўдыторыяй, сёння не трэба далёкага падарожжа за марской галькай. ШКОЛА МАЛАДОГА ЛЕКТАРА ставіць сваёй мэтай развіццё ў студэнтаў творчых здольнасцей, выпрацоўку практычных навыкаў лекцыйнай, прапагандысцкай, агітацыйна - масавай работы.**

ШКОЛА маладога лектара існуе ва універсітэце з 1964 года, зараз у ёй працуюць дзесяць секцый. Для кіраўнікоў школы створаны савет, які праводзіць свае пасяджэнні адзін раз у два месяцы і абмяркоўвае пытанні распрацоўкі і зацвярджэння вучэбных праграм і планаў, работы секцый, лекцыйнай дзейнасці слухачоў.

Мэтанакіравана, творча ідуць заняткі ў секцыях лектараў па праблемах гісторыі КПСС, ВЛКСМ і міжнароднага дэмакратычнага руху. Рабяты арганізоўваюць цікавыя сустрэчы з замежнымі студэнтамі. У школе ўсё шырэй укараняюцца больш актыўныя формы вучобы і выхавання слухачоў. Разам з лекцыямі (адзін раз у месяц) сталі часцей практыкавацца семінарскія заняткі, кансультацыі, дыспуты, атэстацыі, канферэнцыі.

Тэрмін навучання ў школе—два гады. Заняткі праводзяцца тры разы ў месяц.

**А. КАРЖАНЕВІЧ,**
**студэнт мехмата.**

## АМАТАРЫ ФАРБЫ І ПЭНДЗЛЯ

**Спасцігнуць правілы і законы кампазіцыі, даведацца, што такое колеразнаўства, навучыцца працаваць са шрыфтом і самастойна ствараць мастацкія работы ў розных графічных жанрах дапаможа АДДЗЯЛЕННЕ МАСТАКОЎ - АФАРМІЦЕЛЯЎ.**

ЗГАДЗІМСЯ з кіраўніком аддзялення Генадзем Мікалаевічам Агурцовым, што выпускнікі нашы, зразумела, не стануць прафесійнымі мастакамі, але пэўныя навыкі ў афармленні яны атрымаюць. А таксама здолеюць дастаткова развіць свой густ і ўменне «па-мастацку» бачыць свет.

На аддзяленні займаюцца прадстаўнікі амаль усіх факультэтаў універсітэта. Заглянем на заняткі мастакоў-афарміцеляў — засяроджаныя твары, схіленыя над лістамі ватмана. Чорная туш пакідае на белым фоне лініі, стрэлкі, квадраты... Нараджаецца кампазіцыя на фармальным узроўні. Рытм малюнкаў зачароўвае, прымушае ўглядзецца ў іх уважлівей, стварае настрой.

У новым, нечаканым свеце адкрываем мы, напрыклад, кроплі дажджу ў нетрадыцыйных малюнках студэнта ФПМ Вячаслава Рамашкі.

— Разумееце, гаворыць ён,—тое, што я малюю,—абстракцыя. Але кожны дзень на занятках мне даводзіцца мець справу з рознымі паняццямі і формуламі. Усвядоміць і асэнсаваць іх мне вельмі дапамагаюць кампазіцыі, зробленыя на занятках аддзялення мастакоў-афарміцеляў.

**А. АСТАХАВА,**
**студэнтка мехмата.**

## ЗАВІТАЙЦЕ НА БАЛЬ

**Хто з нас не марыць пра баль, сапраўдны, дзе ўсё так прыгожа, дзе здзяйсняюцца самыя неверагодныя жаданні, здараюцца незвычайныя прыгоды! Але ніхто, бадай, і не задумваўся над тым, што і Золушка, і казачны прынц, перш чым прыйсці на доўгачаканае свята, дзесьці вучыліся танцаваць. Заняткі на АДДЗЯЛЕННІ БАЛЬНЫХ ТАНЦАЎ факультэта грамадскіх прафесій дапамогуць вам стаць прыгожымі, пераадолець скаванасць рухаў, набыць пачуццё рытму.**

СУЧАСНЫЯ ТАНЦЫ, працягваючы традыцыі мінулых стагоддзяў, усё ж значна адрозніваюцца ад былых. Хоць і сцвярджаем мы, што стагоддзі праходзяць, а танцы застаюцца. Заўсёды лічылася заслугай уменне добра танцаваць. Тым больш у наш час, калі абавязковай умовай развіцця ўсяго грамадства лічыцца ўсеагульнае, гарманічнае развіццё кожнага чалавека.

Той, хто марыць навучыцца хараша танцаваць або нават атрымаць прафесію кіраўніка аддзяленняў і груп бальных танцаў, можа наведваць заняткі аддзялення бальных танцаў факультэта грамадскіх прафесій. Гэта аддзяленне існуе з 1978 года. Тэрмін навучання—два гады. Заняткі праводзяцца два разы ў тыдзень (лекцыі і практычныя заняткі).

Выкладанне пастаўлена прафесійна: у кожным «навічку» адкрываюцца закладзеныя ў ім здольнасці і даецца найбольш поўнае развіццё іх. І калі ўжо вы сур'ёзна вырашылі займацца танцамі, ад вас патрабуецца зусім нямногае: упартасць, вытрымка і выкананне ўсіх заданняў. А пры сапраўдным жаданні гэта не так ужо і цяжка.

Слухачам на занятках аддзялення адкрываецца непаўторнай красой і своеасаблівасцю чарлстон і факстрот, румба і танга. Усе, хто наведвае заняткі, вельмі хутка пачынаюць больш упэўнена трымаць сябе, прападае няўпэўненасць і баязлівасць. Займайцеся на нашым аддзяленні, і тады пры чароўных гуках заўсёды маладых вальса і танга элегантныя кавалеры запросяць дам, і закружацца пары ў светлым і радасным танцы.

**В. ЛЯШЭНКА,**
**кіраўнік аддзялення бальных танцаў.**



# ЯК СЛОВА НАША АДГУКНЕЦЦА

**Музыцы мовы, граматнаму вымаўленню слоў, правільнаму дыханню, вернаму націску ў словах і фразах — усяму таму, што выпрацоўвае прыгожае маўленне, вас навучаць на АДДЗЯЛЕННІ МАСТАЦКАГА СЛОВА.**

Мова, якая служыць важнейшым сродкам чалавечых зносін, разам з тым з'яўляецца магутнай зброяй культуры. Гэтую ролю мовы нельга не ўлічваць, калі працуеш з вусным ці друкаваным словам. Каб добра пісаць ці гаварыць, трэба перш за ўсё дакладна думаць. Справядлівая заўвага М. Г. Чарнышэўскага: «Што невыразна ўяўляеш, тое невыразна і выкажаш; недакладнасць і заблытанасць выказванняў сведчыць толькі аб заблытанасці думак».

Самая старажытная культура — культура мовы. Вымаўленае ўголас слова набывае асаблівую якасную значнасць. У гэтым яго моц. (Яно колькасна павінна быць больш скупым, чым слова напісанае). А майстэрства чытання ўголас ёсць майстэрства ператварэння пісьмовай, нямой, мовы ў вобразную, мастацкі акрэсленую.

Культура мовы павінна стаць адной з частак эстэтычнага выхавання. Кім бы вы не былі пасля заканчэння універсітэта: выкладчыкамі ці кіраўнікамі навукова-даследчых лабараторый, начальнікамі цэхаў ці служачымі ўстаноў, вы ўсюды будзеце ў акружэнні людзей. Не забывайце пра тое, што, калі вы размаўляеце, яны слухаюць вас. І ў залежнасці ад таго, ЯК і ШТО вы гаворыце, успрымаюць выказанае, даюць вам ацэнку.

**Л. МАРКАЛЁВА,**
**кіраўнік аддзялення мастацкага слова.**



ТЫ ЗАХВАРЭЎ. Захварэў сур'ёзна і, па ўсяму відаць, надоўга. Не жадаеш прымаць ніякіх лекаў, а на матчыны ўздыхі адказваеш жартамі, таму што «хвароба» твая мае вельмі гучную назву: ФАТАГРАФІЯ.

Усё змянілася зараз у жыцці, тваім малодшым братам і сёстрам змены гэтыя да спадобы: з'явіліся новыя цацкі — сапсаваныя плёнкі, вунь, цэлая куча ляжыць, рабі з імі, што душа пажадае! Бацькі ўсміхаюцца: прыгожа на здымку атрымаліся. А ты адчуваеш сябе старажытным алхімікам: састаўляеш растворы, праяўляеш плёнкі, а калі апускаеш фотапаперу ў праявіцель, міжволі згаджаешся з малымі: яна, сапраўды, чароўная, гэтая вада.

Некаторы час табой валодаюць тэхнічныя пытанні, мова стракаціць тэрмінамі «аб'ектыў», «вытрымка», «дыяфрагма». А потым пачынаецца цуд. Раптам ты прыкмячаеш: «Цікавае дрэва, тры гады хадзіў міма, а не заўважаў, якое яно незвычайнае»... Гэта прыходзіць майстэрства. Зараз табе ніколі не будзе сумна — побач фотаапарат, ён дапаможа ўбачыць свет прыгожым.

# КІНАСТУЖКІ СТУДЭНЦКАГА ЖЫЦЦЯ

**Набыць пэўныя тэарэтычныя і практычныя веды ў вобласці фотатэхнікі і кінамастацтва, навучыцца бачыць, а гэта значыць — у звычайным заўважыць нешта захапляючае, зрабіць так, каб тваё бачанне свету, адлюстраванае на фота- ці кінаплёнцы, было цікавым і для іншых — вось задача слухачоў АДДЗЯЛЕННЯ КІНААПЕРАТАРАЎ.**

Курс заняткаў разлічаны на 2 гады. Пасля заканчэння вучобы слухачам выдаюцца пасведчанні кіраўнікоў аматарскіх кінастудый. На першым годзе навучання студэнтам чытаюць курс лекцый па гісторыі фотамастацтва, яны засвойваюць асновы фотатэхнікі, праяўлення, фотадруку, робяць слайд-фільмы. Другі год — прадугледжвае вывучэнне гісторыі кінамастацтва, слухачы атрымліваюць уяўленне аб кампазіцыі кінакадра, літаратурным сцэнарыі, даведваюцца пра ролю музыкі ў фільме, спрабуюць свае сілы ў напісанні рэжысёрскага сцэнарыя і ў практычнай рабоце па стварэнню аматарскіх фільмаў. Гэтыя фільмы з'яўляюцца дыпломнымі працамі і могуць стварацца як адным чалавекам, так і калектыўна.

Вучоба будуецца такім чынам, каб пасля тэарэтычнага курса ішлі практычныя заняткі. Гэта спрыяе замацаванню атрыманых ведаў. Праводзяцца разнастайныя экскурсіі. Так, у 1981-82 навучальным годзе слухачы аддзялення наведалі кінастудыю «Беларусьфільм», пазнаёміліся з працай кінарэжысёраў, кінааператараў, мастакоў, пабывалі ў павільёнах, дзе праходзілі здымкі. Прысутнічалі і на абласным аглядзе аматарскіх фільмаў.

Першая спроба творчых сіл слухачоў аддзялення адбылася ў студэнцкім кафэ «Гаўдэамус», дзе студэнты паказалі свае работы. Галоўнае для аўтараў фільмаў — імкненне падзяліцца з акружаючымі атрыманым эстэтычным задавальненнем, перадаць іншым тое, што ўбачыў, адчуў і перажыў сам. Радуе, што гэтым імкненнем валодаюць усе члены групы кінааператараў. Сіламі студэнтаў былі падрыхтаваны два слайд-фільмы: каляровы «Па Сірыі» і чорна-белы «Спорт у БДУ».

А тых, хто пажадае паспрабаваць сябе ў здымцы фільмаў пра студэнцкае жыццё, паказаць вучэбную і грамадскую дзейнасць універсітэта, расказаць пра свае захапленні — запрашаем да нас!

**В. БАСЬКО,**
**кіраўнік аддзялення кінааператараў.**

ТУРЫСЦКІМІ МАРШРУТАМІ

# Сустрэча з Саянамі

ПРА САЯНЫ, гэты цудоўны горны край, напісана нямала. Тым і прыцягвае ён, што кожны раз дорыць нам новыя пачуцці, нараджае новыя думкі. Непаўторнымі, заўсёды хвалюючымі былі і будуць сустрэчы з Саянскімі рэкамі.

Расказ пойдзе пра Саянскую Аку — мэту і маршрут нашага падарожжа. Сухая геаграфічная даведка і тэхнічнае апісанне маршруту мала гаворыць аб вартасцях ракі. Аднак большасць аматараў воднага турызму лічаць, што яна — адна з самых маляўнічых у Савецкім Саюзе. Карэнныя жыхары (рэчка працякае па тэрыторыі РСФСР і Бурацкай аўтаномнай рэспублікі) называюць яе коратка — Ака. Яшчэ яны гавораць: Рака. З такой бясконцай увагай, быццам гаворка ідзе аб тым, што ў глыбіні душы звязана з імем бацькі і маці.

З радасным пачуццём падляталі мы да Акі, пераадолеўшы перавал каля самай граніцы з Манголіяй. Ззаду засталіся хваляванні, незабыўная панарама Саянскіх хрыбтоў за ілюмінатарам самалёта. Першае знаёмства з рэчкай — гэта папяліста-шэрае поле эдэльвейсаў, пяшчотна-зялёная хвоя, сіняе неба і празрысты блакіт вады. Усё купалася ў мяккіх промнях вячэрняга сонца. Напоўненае лёгкім водарам тайгі, горнае паветра яшчэ больш узмацняе адчуванне спрадвечнай чысціні і некранутасці.

Рабочы дзень на маршруце пачынаўся рана, з абавязковай працэдуры — падрыхтоўкі плытоў, упакоўкі рэчаў. Нарэшце, мы на вадзе. Першыя ўзмахі вёсламі дастаўляюць усім вялікае задавальненне. Прыемна адчуць сваю сілу, пачуць, што нават тут, на быстрыні, судна падпарадкавана волі экіпажа. Бег вады хуткі, але роўны, злёгку ўсхваляваны на перакатах. З шорахам мільгаюць пад плытамі рознакаляровыя камені. Праз некалькі гадзін парослыя салатавай тайгой схілы уступаюць месца стромкім сценам, спаласаваным уздоўж і ўпоперак маляўнічым узорам глыбокіх маршчын-трэшчын. Каля самай вады — нагрувашчванне вострых каменняў, метраў пятнаццаць вышэй сцены абрываюцца і даюць пачатак працяжным далінам. Рэчка прарэзвала свой шлях праз лававыя палі, сляды далёкага геалагічнага мінулага Прыбайкалля. Месца стаянкі ля пясчанай касы, намытай прытокам Акі Жом-Балакам, такое прыгожае, што па аднадушнай думцы вырашана зрабіць днёўку. Ранніцой частка групы робіць пешую вылазку ў тайгу ўздоўж прытока. Вечарам вясёлы гоман у лагеры заціхае. Заўтра сустрэча з жамчужынай Акі — цяснінай Орха-Бом; той момант, якога з затоеным хваляваннем чакаў кожны ўдзельнік нашага падарожжа.

Даліна Акі заціснута астрогамі вялікага Саянскага хрыбта. Перад уваходам у цясніну горы расступаюцца, рэчка разбіваецца на некалькі рукавоў і, запавольваючы свой бег, доўга пятляе сярод буйных лугоў, навіслых над вадой дрэў. Затым схілы ссоўваюцца так блізка, што нават з малой адлегласці здаецца, быццам паток знікае пад зямлёй. Хаця мы і ўваходзілі ў Орха-Бом калі сонца стаяла яшчэ высока, цень, што наваліўся над цяснінай, і прахалода ад абступіўшых скал, стваралі ўражанне вячэрняга змроку. Здавалася, шлемы пазвальваюцца з нашых галоў у ваду пры поглядзе ў сіняе неба, у якім павольнымі кругамі рассякалі паветра арлы. Рэчышча значна звузілася, хуткасць узрасла, з'явіліся валы, якія то стваралі адчуванне палёту, то раптоўным ударам аблівалі каскадам пырскаў.

Сярод сямідзесяці перашкод, адзначаных на маршруце, шэсцьдзесят дзве прыходзяцца на восемдзесят кіламетраў цясніны Орха-Бом. Найбольш небяспечныя, што патрабавалі перад праходжаннем абавязковага агляду, сканцэнтраваны ў яе верхняй частцы. У такіх месцах паспяховы праход у многім вызначаўся выбарам аптымальнага варыянта заходу ў парог, зладжанасцю работы ўсяго экіпажа. На першы погляд можа паказацца, што дзякуючы паўнаводнасці Акі, работа на яе парогах не патрабуе пастаяннага фізічнага і нервовага напружання, асцярожнасці і ўвагі. Але ўражанне гэта было падманлівым.

...Вечарамі, пасля цяжкіх працоўных дней, мы былі з лішкам узнагароджаны сапраўды цудоўнай рыбалкай. Пра яе можна напісаць асобны расказ. Асобна патрэбна пісаць і аб той, яшчэ не парушанай чалавекам гармоніі прыроды Орха-Бома, выражанай і ў здзіўленым павароце галавы мядзведзя, што пасецца на ягадніку, і ў па-дзіцячаму адкрытым абліччы эдэльвейсаў і тысячы іншых дэталей. Аднак усе мы разумелі, што гэтым яднаннем з цудоўным абавязаны першапраходцам зямлі сібірскай. Зямля гэта паліта крывёю і потам тысяч людзей: першаадкрывальнікаў, вучоных, вынаходнікаў і многіх іншых, чые імёны ніколі не будуць забыты. У самым пачатку цясніны ўзнялася ўвысь велізарная скала, якая носіць імя легендарнага камандзіра грамадзянскай вайны Н. А. Каландарашвілі. Іменна тут прыйшлося хавацца яму на працягу доўгай сібірскай зімы ад калчакаўцаў, якія акупіравалі Прыбайкалле ў 1919—1920 гадах. І толькі непахісная воля змагара дапамагла яму выстаяць.

Назаўсёды застанецца ў памяці расставанне з Орха-Бомам, які раствараўся ў свінцовай шапцы воблакаў. Мы былі ўдзячны Орха-Бому за тыя рэдкія імгненні сумленнага паядынку з воднай стыхіяй, за тое, што кожны з нас глыбей зразумеў наваколле і самога сябе, стаў крышачку дабрэй. І хаця наперадзе была яшчэ сустрэча з Байкалам, мы з сумам усведамлялі, што падарожжа падыходзіць да канца. Размовы былі напоўнены марамі аб новых маршрутах, новых рэках. Аднак кожны з нас спадзяваўся і верыў, што вернецца сюды, каб зноў сустрэцца з Орха-Бомам.

**С. ШЫРАЕЎ,**
**малодшы навуковы супрацоўнік НДІ ПФП імя А. Сеўчанкі, удзельнік паходу.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

7 кастрычніка 1982 г.
Зак. 1788 АТ 21498

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ